За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 7 (102) 1-20 красавіка 2015 г.

Леаніда Аўтухова асудзілі без адваката, не задаволіўшы ніводнага хадайніцтва

Падставай для адміністрацыйнай справы, якую разглядаў Гарадоцкі райсуд, стаў запіс у кнізе скаргаў, зроблены сябрам партыі БНФ Леанідам Аўтуховым. Ён параўнаў начальніка раённай управы па працы, занятасьці і сацыяльным забесьпячэньні Пятра Прасолава з «тэрарыстам у Луганску і Данецку». Суд прызначыў пакараньне − 30 базавых штрафу.

Судзіць Леаніда Аўтухова пачалі яшчэ 30 сакавіка. 9 красавіка судзьдзя Аляксандра Носава вынесла пастанову пра штраф. За гэты час у Гарадоцкім РАУС пасьпелі памяняць абвінавачаньне супраць актывіста.

Запіс, які стаў падставай для судовага разбору, зьявіўся пасьля таго, як Аўтухова зьнялі з уліку па беспрацоўі ў цэнтры занятасьці. Актывіст перакананы, што гэта было незаконна. І зрабіў запіс у кнізе скаргаў, хочучы падкрэсьліць, што начальнік раённай управы па працы, занятасьці і сацыяльным забесьпячэньні спадар Прасолаў падтрымлівае несправядлівае рашэньне. Аднак чыноўнік убачыў у словах пра «тэрарыста ў Луганску і Данецку» абразу, распавёў Леанід Аўтухоў:



Леанід Аўтухоў

«Я хацеў, каб на запіс у кнізе скаргаў зьвярнула ўвагу начальства Пятра Прасолава. А ён напісаў заяву ў міліцыю. На мяне склалі пратакол паводле адміністрацыйнага артыкулу 9.3 — за «абразу, сьвядомае прыніжэньне гонару і годнасьці асобы, выказанае ў непрыстойнай форме». 30 сакавіка распачаўся суд, і ў першы ж дзень судзьдзя Аляксандра Носава абвясьціла перапынак больш як на тыдзень. Не паведаміўшы пра гэта падчас працэсу, яна пастанавіла адправіць пратакол на дапрацоўку ў райаддзел міліцыі. Я даведаўся пра гэта выпадкова, калі прыйшоў у суд больш падрабязна вывучыць матэрыялы справы. А іх там ужо не было».

Судзьдзя сказала спадару Аўтухову зайсьці да яе па абедзе 3 красавіка. Маўляў, матэрыялы справы ўжо будуць у яе. Аднак тут жа ў суд зьявіліся міліцыянты і заявілі, што склалі на актывіста новы пратакол — ужо паводле іншага артыкулу — 23.5 КаАП за «абразу службовай асобы пры выкананьні службовых паўнамоцтваў асобай, не падначаленай па службе».

Пра лёс першага пратаколу і першай сваёй справы Леаніду Аўтухову засталося толькі здагадвацца — у пачатку судовага паседжаньня 8 красавіка судзьдзя сказала, што ранейшай справы няма, і што яна разьбірае ўжо новую.

«У маім запісе не было ніводнага нецэнзурнага слова, аднак міліцыянты сьпярша склалі пратакол менавіта з такім абвінавачаньнем. Судзьдзя адправіла дакумэнты «на дапрацоўку». Аднак ніхто нічога дапрацоўваць не стаў. У міліцыі проста склалі іншы пратакол», — працягвае Леанід Аўтухоў.

Падчас судовага працэсу ён хадайнічаў, каб у якасьці сьведак выклікалі капітана міліцыі Собалева, які склаў новы пратакол, нават ня ўзяўшы тлумачэньняў. Аднак судзьдзя не задаволіла ні гэтае хадайніцтва, ні яшчэ 4 хадайніцтвы, зь якімі зьвяртаўся Аўтухоў. Істотна, што адно зь іх тычылася ўдзелу ў працэсе адваката. Таму актывіст лічыць, што суд незаконна пазбавіў яго права на абарону:

"8 красавіка, калі суд распачаўся ўжо паводле новага пратаколу, я ўсё ж вырашыў зьвярнуцца па дапамогу адваката. Заявіў пра гэта на судзе, і судзьдзя Аляксандра Носава абвясьціла перапынак на адны суткі. Пошукі адваката я пачаў у Віцебску, але ў адвакацкай канторы вольных адвакатаў не было. Вярнуўся ў Гарадок, знайшоў адваката, але гэтая спадарыня была вольная 9 красавіка толькі з 16 гадзін. Яна пагадзілася мяне бараніць, але зранку на працы яе не было, і дамову заключыць я ня змог. Суд распачаўся а 14-й, я папрасіў дадатковы перапынак, каб да 16 прыйсьці да адваката па дамову. Але судзьдзя сказала, што чакаць ня будзе. Перад тым яна спытала меркаваньне на гэты конт у Пятра Прасолава, і той сказаў: Ня трэба цягнуць ката за хвост".

Леанід Аўтухоў упэўнены, што яго судзілі з парушэньнямі заканадаўства і ягоных правоў. А яшчэ ў тым, што ягоныя правы былі парушаны і падчас зьняцьця з уліку па беспрацоўі, і яшчэ раней − калі ў 2008 годзе яго скарацілі перад выбарамі ў Палату прадстаўнікоў, куды ён балятаваўся. З тае пары ён меў больш за 40 спробаў уладкавацца на працу, але гэта яму так і не ўдалося, у тым ліку з дапамогай рэгіянальнага цэнтру занятасьці.

Актывіста БХД зь Мёраў пазбавілі працы

З 10 красавіка актывіст стваранай партыі БХД зь Мёраў Сяргей Васільеў застаўся бяз працы − зь ім не працягнулі кантракт. 14 красавіка ён стаў на ўлік па беспрацоўі, але грашовую дапамогу памерам 360 тысяч рублёў зможа атрымаць толькі 20 траўня.

Раней намесьнік начальніка раённага цэнтру занятасьці Ігар Швец абяцаў, што спадара Васільева не пакінуць бяз працы. Больш таго — што падбяруць яму працу па спэцыяльнасьці. Але абяцаньні аказаліся марныя, кажа цяпер ужо беспрацоўны актывіст, наведаўшы сацыяльную ўстанову:

«У цэнтры занятасьці літаральна выкінулі мяне на вуліцу! Паставілі на ўлік, узялі два мае дыплёмы аб вышэйшай адукацыі і нават нічога не паабяцалі. Прызначылі грашовую дапамогу памерам дзьве базавыя, а першая выдача — ажно 20 траўня. Як хочаш камунальныя плаці, лекі купляй, я ўжо не кажу пра тое, што трэба есьці і апранацца. Яшчэ добра, што ў мяне сям'і няма! Во ў якой сацыяльна-арыентаванай дзяржаве мы жывём — не працаўладкавалі, ды яшчэ й літаральна голадам мораць! Я ж да таго часу магу і ласты склеіць!»


Сяргей Васільеў

Сяргей Васільеў мае пэдагагічную і культуралягічную адукацыю. Да 2010 году працаваў у школе, але мусіў звольніцца, каб даглядаць старую маці. Потым былі выбары, пасьля якіх спадар Васільеў атрымаў 15 сутак за ўдзел у Плошчы. А калі вярнуўся дахаты, уладкавацца настаўнікам ужо не атрымалася. І ён мусіў пайсьці працаваць грузчыкам, дзе падарваў здароўе. У актывіста хворыя лёгкія і сьпіна, праз гэта яму нельга падымаць больш як 5 кіляграмаў. Што й стала прычынай непрацягненьня кантракту ў мясцовым райпо, дзе ён працаваў памочнікам экспэдытара, а па сутнасьці — ізноў жа грузчыкам.

Нібыта ўсё слушна: ня можаш працаваць у адным месцы, дык шукай працы ў іншым. Але працы для яго, выглядае, няма ва ўсім Мёрскім раёне, разважае Васільеў:

«Хваробы хваробамі, але ж у мяне дзьве спэцыяльнасьці, па якіх праца не вымагае фізічных высілкаў. Дык ня могуць мне прапанаваць працы хоць у вясковай бібліятэцы. Я ж сам на сяло рвуся! Дык кажуць, што ўсё там зачыняецца... А чаму яно зачыняецца, калі па беларускім тэлебачаньні цьвердзяць, што ўсё ў нас квітнее? Ведаеце, у мяне ж кніжка ў выдавецтве пра гісторыю Мёраў, і другая кніжка ўжо гатовая, на дыску запісаная. Дык вось так мне родны горад аддзячыў!»

Намесьнік старшыні Віцебскага гарвыканкаму забараніў шэсьце ў гадавіну Чарнобыльскай катастрофы

Прычына забароны акцыі, заяўку на правядзеньне якой падавалі віцебскія сябры КХП-БНФ, традыцыйная. Намесьнік старшыні Віцебскага гарвыканкаму Дзьмітры Шэрыкаў забараніў вулічнае шэсьце, спаслаўшыся на адсутнасьць у заяўнікаў дамоваў на яго абслугоўваньне камунальнікамі, мэдыкамі і міліцыянтамі.

Паводле словаў Яна Дзяржаўцава, аднаго з заяўнікаў забароненага шэсьця, улады ўжо дзясяткі разоў не давалі яму і яго аднапартыйцам дазволаў на акцыі менавіта на падставе адсутнасьці згаданых дамоваў. Як правіла, абслугоўваць мерапрыемствы апазыцыі пагаджаюцца толькі камунальнікі, у міліцыі ж і паліклініцы заўсёды знаходзяць нейкія прычыны, каб ухіліцца ад заключэньня дамоваў.

Гэтым разам усё адбылося як звычайна. Арганізатары шэсьця накіравалі заявы на заключэньне дамоваў у патрэбныя інстанцыі − і атрымалі адмовы.

Галоўны лекар Віцебскай гарадзкой цэнтральнай паліклінікі Станіслаў Цітовіч паведаміў, што мэдычнае абслугоўваньне масавых мерапрыемстваў ажыцьцяўляецца брыгадамі гарадзкой станцыі хуткай дапамогі пры адсутнасьці вялікай колькасьці выклікаў, «у сапраўдны перыяд назіраецца высокая абарачальнасць насельніцтва» *(дакладная цытата на мове арыгіналу)*, таму скасаваць загадзя дзейнасьць брыгад хуткай дапамогі на дату меркаванага мерапрыемства нельга — такім чынам, заключэньне дамовы не ўяўляецца магчымым.

Быў атрыманы адказ і зь міліцыі. Намесьнік начальніка УУС Віцебскага аблвыканкаму Юры Манькоў напісаў, што яго ведамства нібыта ня супраць заключэньня дамовы, але толькі пасьля таго, як гарвыканкам дасьць дазвол на правядзеньне шэсьця. Фактычна, гэта ёсьць адмова: згодна з рашэньнем Віцебскага гарвыканкаму «Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску», прынятым у 2009 годзе, арганізатары акцыяў павінны заключаць неабходныя дамовы да, а не пасьля атрыманьня дазволаў на масавыя мерапрыемствы; без такіх дамоваў, заключаных загадзя, правядзеньне мерапрыемстваў не дазваляецца.

Цягам амаль 6 гадоў, што мінулі з моманту прыняцьця рашэньня, якое рэгулюе парадак правядзеньня масавых мерапрыемстваў у Віцебску, мясцовым грамадзкім і палітычным актывістам ні разу не ўдалося выканаць патрабаваньні гэтага рашэньня, і ўлады ні разу не далі дазволу на правядзеньне пікетаў, мітынгаў ці вулічных шэсьцяў.

Актывісты спрабавалі зьмяніць сытуацыю праз звароты ў суды, патрабуючы скасаваць або зьмяніць невыканальнае рашэньне, але ўсе іх намаганьні былі беспасьпяховымі. Паводле судзьдзяў, рашэньне Віцебскага гарвыканкаму прайшло юрыдычную экспэртызу, прызнанае не парушаючым дзейнае заканадаўства, а таму няма патрэбы нешта зьмяняць.

Віцебскі праваабаронца дамогся выпраўленьня парушэньняў заканадаўства з боку супрацоўнікаў судоў

Пасьля зваротаў у Вярхоўны Суд праваабаронцу Паўлу Левінаву ўдалося дамагчыся выпраўленьня хібаў у працы судоў Чыгуначнага раёну Віцебску і Лепельскага раёну Віцебскай вобласьці, якія ўзьніклі праз недастатковы кантроль з боку кіраўніцтва судоў за дзейнасьцю сваіх падначаленых і неналежнае захоўваньне маёмасьці.

Увесь цывілізаваны сьвет, далучыцца да якога, спадзяюся, мае намер і наша краіна, імкнецца да пабудовы трывалай прававой сыстэмы, якая мусіць стаць гарантам справядлівых, прававых узаемадачыненьняў паміж грамадзянінам і дзяржавай. І добра, калі канфлікты, што ўзьнікаюць паміж імі, вырашаюцца выключна ў межах прававога поля.



Улічваючы недасканаласьць чалавечае істоты, цяжка ўявіць час, калі асобныя грамадзяне перастануць парушаць закон. Але стакроць цяжэй зьмірыцца з тымі фактамі, калі ў ролі парушальнікаў выступаюць прадстаўнікі судовай сыстэмы.

Простыя грамадзяне мусяць добра ўсьведамляць, што бязь іхнага актыўнага кантролю за дзейнасьцю асобных чыноўнікаў дзяржава няздольная стварыць справядлівую прававую сыстэму. На Віцебшчыне ў ролі гэткага сьвядомага барацьбіта з недасканаласьцю судовай сыстэмы не ўпершыню выступае праваабаронца Павал Левінаў.

Так, пастановай суду Чыгуначнага раёну Віцебску ад 17 сьнежня 2014 году за парушэньне вызначанага парадку арганізацыі і правядзеньня пікетаваньня Павел Язэпавіч быў аштрафаваны ў памеры 25 базавых велічыняў (тады гэта складала 3 мільёны 750 тысяч рублёў). Пагадзіцца зь несправядлівым, на ягоную думку, рашэньнем суду, якое супярэчыць асноўным дэмакратычным прынцыпам, спадар Левінаў ня змог. Таму праз абнародаваньне прыкладаў неналежнага выкананьня заканадаўства судамі і іх служкамі вырашыў прадэманстраваць сваю маральную перавагу, як грамадзяніна, над свавольствам судовай сыстэмы.



Павал Левінаў

Спадар Левінаў высьветліў, што інфармацыя, разьмешчаная на стэндзе Чыгуначнага суду Віцебску ад 10 студзеня «ўводзіць грамадзян у зман, а менавіта, пазначае, што памер базавай велічыні ў адпаведнасьці з пастановай Савету Міністраў РБ ад 25 сакавіка 2014 г. № 255 "Аб устанаўленьні памеру базавай велічыні" складае 150 000 рублёў». І гэта пры тым, што «ў адпаведнасьці з пастановай Савету Міністраў РБ ад 29 сьнежня 2014 году № 1255 ...базавая велічыня вызначаная ў памеры 180 000 рублёў».

Спачатку па тлумачэньне праваабаронца зьвярнуўся да старшыні Чыгуначнага раёну Віцебску. У сваё апраўданьне старшыня суду Раіса Лупянкова паведаміла, што 3 лістапада 2014 году «нявысьветленая асоба зьняла «з інфармацыйнага стэнду, разьмешчанага на 1-м паверсе будынку суду, інфармацыю аб вызначэньні памеру базавай велічыні... ў суме 150 000 рублёў». А пасьля, 10 студзеня 2015 году, тая самая асоба замест інфармацыі пра сэмінар разьмясьціла на стэндзе раней зьнятую інфармацыю.

Апрача гэтага парушэньня, 11 сакавіка Павал Левінаў заўважыў, «што на будынку суду Чыгуначнага раёну г. Віцебску на больш як двухмэтровай вышыні ўсталяваная шыльда, згодна зь якой гэты суд падведамасны Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь», а не Вярхоўнаму Суду РБ, як насамрэч.



Адзначыўшы згаданыя факты, Павал Левінаў даслаў у Вярхоўны Суд скаргу, у якой паставіў пад сумнеў законнасьць вынесенага яму прысуду і папрасіў сярод іншага зрабіць неадкладныя захады для навядзеньня належнага парадку ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску.

У сваім другім лісьце ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь спадар Левінаў у якасьці дадатковага прыкладу, які сьведчыць пра недастатковы кантроль з боку кіраўніцтва асобных судоў за дзейнасьцю падначаленых і неналежнае захоўваньне маёмасьці, прывёў факт, выяўлены 16 сакавіка ў Лепелі. Павал Левінаў убачыў, што «на будынку суду Лепельскага раёну Віцебскай вобласьці на месцы разьмяшчэньня Дзяржаўнага Сьцягу Рэспублікі Беларусь знаходзіцца нейкае абшарпанае палотнішча з колерамі Дзяржаўнага Сьцягу Рэспублікі Беларусь». У такім стаўленьні да дзяржаўнай сымболікі ён угледзеў зьдзек са сьцягу і папрасіў Вярхоўны Суд зрабіць адпаведныя захады.

Скаргі, дасланыя праваабаронцам у Вярхоўны Суд, былі перанакіраваныя ў Віцебскі абласны суд, адкуль за подпісам ягонага старшыні Мікалая Хамічонка Левінаў і атрымаў адказы на ўзьнятыя ў лістох пытаньні. Старшыня Віцебскага абласнога суду паведаміў, што «ў цяперашні час на будынку суду Лепельскага раёну Віцебскай вобласьці размешчаны Дзяржаўны сьцяг Рэспублікі Беларусь, які адпавядае ўсім неабходным патрабаваньням. На адрас старшыні суду Нікіцінай В.Л. накіраванае прадстаўленьне аб неабходнасьці ажыцьцяўленьня пастаяннага кантролю за станам дзяржаўнай сымболікі Рэспублікі Беларусь у судзе. Апроч таго, старшыня суду Нікіціна В.Л. за неналежнае ўтрыманьне будынку ў адпаведнасьці з вызначанымі патрабаваньнямі па выніках працы за месяц дэпрэмаваная».

Што тычыцца фактаў парушэньняў, зафіксаваных праваабаронцам у судзе Чыгуначнага раёну, то памылковыя зьвесткі аб падпарадкаваньні суду «Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь, ліквідаваныя», а «старшыні суду Чыгуначнага раёну г. Віцебску Лупянковай Р.К. строга ўказана на адсутнасьць належнай арганізацыі працы суду па агульных пытаньнях».

Міліцыя перашкодзіла ўсталяваць новыя крыжы на месцы меркаваных сталінскіх расстрэлаў пад Хайсамі


Ян Дзяржаўцаў

16 красавіка каля вёскі Хайсы пад Віцебскам быў затрыманы актывіст КХП-БНФ Ян Дзяржаўцаў, які плянаваў усталяваць крыжы на месцы меркаваных сталінскіх расстрэлаў. У міліцыі з затрыманых узялі тлумачэньні і праз 3 гадзіны адпусьцілі.

Як паведаміў Ян Дзяржаўцаў, актывісты КХП-БНФ зьбіраліся ўсталяваць крыжы ў памяць забітых там людзей — актывісты мяркуюць, што там пахаваныя ахвяры сталінскіх рэпрэсіяў. Першым да вёскі Дрыкольле прыехаў сам Ян Дзяржаўцаў, ён і прывез крыжы.

Паводле слоў актывіста, на стаянцы яго ўжо чакалі супрацоўнікі міліцыі і КДБ, старшыня сельсавету і прадстаўнік лягсасу. Яны заявілі Дзяржаўцаву, што ён ня мае права тут нічога ставіць. Дзяржаўцава затрымалі і павязлі ў РАУС Віцебскага раёну.

Як паведаміў Ян Дзяржаўцаў, яму нават не патлумачылі прычыну затрыманьня: «Учора разам зь сябрамі мы хадзілі да старшыні Мазалаўскага сельсавету Леаніда Дубіны з просьбай паспрыяць, каб гэтае месца, Хайсы, было добраўпарадкаванае: каб была пракладзеная дарога, прыбраны хмызьняк, каб там можна было ўсталяваць памятны знак. Аднак старшыня з намі не пагадзіўся, пачаў спрачацца і заявіў, што няма доказаў таго, што ў гэтым месцы пахаваныя ахвяры сталінізму. Ён усчаў сварку, і ў выніку мы мусілі сысьці. А сёньня дамовіліся, каб перад Радаўніцай уласнымі сіламі прыбраць гэтае месца і ўсталяваць два новыя крыжы да тых, якія былі ўсталяваныя раней. Але калі прыехалі на месца, неўзабаве зьявілася машына ДАІ, яшчэ дзьве міліцэйскія машыны, а таксама зьявіўся сам старшыня Дубіна. Кіроўцу грузавіка загадалі загрузіць крыжы, і цяпер мы накіроўваемся ў міліцыю».

Паводле Яна Дзяржаўцава, гэткім чынам мясцовыя ўлады хочуць схаваць праўду пра месца згубы бязьвінных ахвяраў савецкага рэжыму: «Гэта вялікая небясьпека для ўладаў — яны ня хочуць, каб людзі прыходзілі на гэтае месца, каб узгадвалі злачынствы ўладаў. Раней забівалі людзей і рабілі таямніцу, а цяпер робяць таямніцу вакол сьлядоў злачынства».

Паводле Яна Дзяржаўцава, некалькі актывістаў засталіся ў Хайсах. Але памятная талака была сарваная і перапыненая яшчэ да таго, як пасьпелі сабрацца ўсе яе ўдзельнікі.

Па стане на 14 гадзін актывіста КХП-БНФ Яна Дзяржаўцава, які плянаваў усталяваць крыжы на месцы сталінскіх расстрэлаў пад Віцебскам, адпусьцілі зь міліцыі. Як паведаміў Ян Дзяржаўцаў, у міліцыі з затрыманых узялі тлумачэньні наконт іх дзеяньняў і праз тры гадзіны адпусьцілі. Акрамя пратаколу апытаньня іншых пратаколаў не складалася.

Сьледчы камітэт цікавіцца прыватным ліставаньнем доктара Пастнова

8 красавіка доктар Ігар Пастноў быў выкліканы для гутаркі ў Віцебскі гарадзкі аддзел Сьледчага камітэту. Позву сьледчая ўручыла асабіста, прыйшоўшы проста на працу.

Як распавёў спадар Ігар, маёр СК Кісьляк Н.В. паводзілася вельмі карэктна, патлумачыўшы, што пакуль ідзе праверка па факце напісаньня яго ліста Сяргею Рыжову ў СІЗА. У лісьце былі нядобрыя выказваньні пра адну з судзьдзяў Першамайскага суду, якая праславілася сваім паказным жорсткім стаўленьнем да іншадумцаў.

Ліст цэнзары прачыталі, адрасату не аддалі, паслужліва пераслалі ў суд, асабіста судзьдзю, пра якую ў ім вялося. Тая ў сваю чаргу пераслала яго ў СК для праверкі на прадмет наяўнасьці складаў злачынстваў.



Ігар Пастноў

У сувязі з гэтым сам Пастноў абураецца: *«Рэжым баязьлівы. Ён баіцца адкрытай барацьбы з апанэнтамі, шукае слабыя месцы, пункты мішэні і б'е па іх. Паскудна і жорстка. Я ж заявіў, што гэта маё асабістае інтымнае ліставаньне. І прапанаваў чытаць сайт «Свабодны рэгіён», мае адозвы, дзе я адкрыта абвінавачваю прыслужнікаў рэжыму ў фальшаваньні і жорсткасьці. Калі ёсьць за што, я гатовы адказаць. Улада слабая і баязьлівая. І трымаецца толькі на слабасьцях і разладах у апазыцыі. Яна капаецца ў бруднае бялізьне, зьбіраюць пра мяне інфармацыю ў суседзяў... Шукаюць слабыя месцы ў побыце і на працы ... Адкрытай ідэалягічнай барацьбы пазьбягаюць. Паскудна і брыдка...»*

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайту http://vitebskspring.org і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.